**49.** Разгледзьце ўзор напісання адраса на канверце. Што размешчана ў левым верхнім вугле, што — у правым ніжнім?

Хто такі адпраўнік (адпраўшчык)?

Хто такі атрымальнік?

***піса́ць на а́драс***




**50.** Уявіце сітуацыю. Ваш клас прымае ўдзел у арганізацыі сустрэчы са знакамітым земляком (ветэранам вайны, працы, пісьменнікам, касманаўтам і г. д.). Вам даручылі (ад імя класа) напісаць запрашэнне гэтаму чалавеку з просьбай прыняць удзел у мерапрыемстве. Што трэба напісаць у запрашэнні? Падпішыце адрас.

## § 9. Публіцыстычны стыль, яго жанры, сфера выкарыстання

**51.** Выразна прачытайце тэкст. У чым хоча пераканаць нас аўтар?

### Дзень народнага адзінства

17 верасня ў Беларусі адзначаецца дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства. Гэта свята сімвалізуе нацыянальную, дзяржаўную і тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі.

У 1921 годзе па ўмовах Рыжскага дагавора заходняя частка нашай краіны была ўключана ў састаў Польшчы. Амаль 20 гадоў беларускі народ падзяляла мяжа. Але 17 верасня 1939 года Чырвоная армія перайшла мяжу з Польшчай і пачала вызваленчы паход. Яго вынікам стала аб'яднанне Заходняй Беларусі і БССР. Нарэшце спраўдзілася мара беларусаў — жыць у адной дзяржаве.

Наша адзінства — сапраўдная нацыянальная каштоўнасць, якую неабходна паважаць, берагчы і абараняць! *(Паводле В. Ванінай)*.

Чаму Дзень народнага адзінства адзначаецца 17 верасня? У чым сутнасць гэтага свята?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**52.** Прачытайце табліцу. Раскажыце на яе аснове аб прыметах публіцыстычнага стылю.

| ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ СТЫЛЬ | | | |
|---|---|---|---|
| **Прыметы стылю** | | | |
| **з якой мэтай выкарыстоўваецца** | **дзе выкарыстоўваецца** | **моўныя сродкі** | **жанры** |
| уздзейнічаць на думкі і пачуцці людзей, пераканаць у чым-небудзь | у газетах, часопісах, радыё- і тэлеперадачах, вусных выступленнях | кніжныя і гутарковыя словы, словы і словазлучэнні з ацэначным значэннем; пабуджальныя і клічныя сказы | выступленне; артыкул, нататка*, інтэрв'ю, нарыс |

Для публіцыстычнага стылю характэрны:
- эмацыянальнасць і ацэначнасць;
- пабуджальнасць (заклік да пэўных дзеянняў);
- даходлівасць і надзённасць (актуальнасць).

**53.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго прыналежнасць да публіцыстычнага стылю.

Штогод у першую нядзелю кастрычніка ўшаноўваюць настаўнікаў. Кажуць, што сапраўдны настаўнік — гэта чалавек ад Бога, а ўсе іншыя прафесіі — ад настаўніка. Толькі чалавеку з асаблівым талентам хопіць мужнасці і цярпення ўзяць на сябе адказнасць за выхаванне новага пакалення. Таму прафесійнае свята педагогаў заўсёды праходзіць цікава, узнёсла і адкрыта. Менавіта настаўнікам адрасуюцца словы шчырай падзякі за талент[л], мудрасць, імкненне аддаць вучням цеплыню сваёй душы, часцінку свайго сэрца... *(Паводле І. Лубнеўскага)*.

**54.** Прачытайце словы ўслых. Растлумачце іх напісанне. Якому правілу яны адпавядаюць? Спішыце гэтыя словы, дапоўніўшы ра́ды двума-трыма ўласнымі прыкладамі на гэта правіла.

1. Разумны, сардэчны, ...
2. Жыццё, выхаванне, ...
3. Настаўнік, заўсёды, быў, ...
4. Падзяка, дзякуючы, ...

**55.** Прачытайце два віншаванні. Назавіце ў іх прыметы публіцыстычнага стылю. Як вы думаеце, хто іх адрасат і адрасант? Якія часткі ў іх можна выдзеліць?

| | |
|---|---|
| адрасант | той, хто піша (гаворыць) |
| адрасат | той, хто атрымлівае (слухае) |

**I.** Вы, як другая маці, ведзяце нас у дарослае жыццё, даяце нам веды, якія дапамогуць нам жыць і працаваць для сябе і ўсёй краіны. Шчыры дзякуй Вам за разуменне, цярпенне, мудрасць. Жадаем Вам здароўя, дабрабыту, старанных і таленавітых вучняў.

**II.** Дарагая матуля, віншую цябе з днём нараджэння! Ты для мяне самы родны чалавек. Я жадаю табе добрага здароўя, сіл і натхнення. Дзякуй за тое, што ты заўсёды побач са мною. Я вельмі люблю цябе. Будзь шчаслівай!

Віншаванні звычайна складаюцца з некалькіх частак:

1) прывітальная формула (зварот, прывітанне): *Паважаны (-ая, -ыя) ...; Дарагі (-ая, -ія) ...; Шаноўны (-ая, -ыя) ...* і г. д.;

2) віншаванне: *Шчыра (сардэчна) віншую (-ем) з ...; Прыміце нашы шчырыя віншаванні з нагоды ...* і г. д.;

3) пажаданні: *Найлепшыя святочныя пажаданні! Самыя лепшыя пажаданні здароўя, настрою, плёну! Шчаслівага свята! Ад усёй душы жадаю здароўя, дабрабыту і здзяйснення ўсіх жаданняў. Хай заўсёды будзе добрым Ваш шлях!*;

4) падзяка: *Шчыры дзякуй за разуменне, цярпенне, мудрасць*;

5) подпіс.

**56.** Падрыхтуйце тэкст віншавання з днём нараджэння ці іншым святам (для маці, бацькі, бабулі, дзядулі, сябра, настаўніка).



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі